# РАЗДЗЕЛ II. РАЗВІЦЦЁ ПРАВА Ў СТАТУЦЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1529 ГОДА, ЯГО ЗНАЧЭННЕ І МЕСЦА Ў ЕЎРАПЕЙСКАЙ ДЗЯРЖАЎНА-ПРАВАВОЙ ГІСТОРЫІ

## ПЕРАДУМОВЫ РАСПАЎСЮДЖАННЯ ПІСАНАГА ПРАВА Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У XIV-XVI СТАГОДДЗЯХ

**Дз. В Шчэрбік**
*дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск, Беларусь*

У публікацыі даследуецца гісторыя станаўлення пісанага права ў ВКЛ у XIV – XVI стст. Аналізуюцца культуралагічныя і палітыка-прававыя перадумовы, замежныя ўплывы і ідэйнае абгрунтаванне ўвядзення пісанага заканадаўства, яго распаўсюджання і станаўлення як асноўнай крыніцы права.

В публикации исследуется история становления писаного права в ВКЛ в XIV- XVI вв. Анализируются культурологические и политико-правовые предпосылки, иностранное влияние и идейное обоснование введения писаного законодательства, его распространения и становления как основного источника права.

The publication explores the history of law in the Grand Duchy of Lithuania in the fourteenth and sixteenth centuries. Cultural and political-legal background, foreign influence and ideological justification, which formed the basis for the transition from customary law to statutory law and its codification are analyzed.

Сярэднявечныя дзяржавы прайшлі доўгі шлях да шырокага распаўсюджання пісанага права і яго станаўлення як асноўнай формы замацавання прававых нормаў. Можна вылучыць некалькі этапаў распаўсюджання пісанага права на тэрыторыі сярэднявечнай Усходняй Еўропы, а таксама шэраг фактараў, якія на гэта паўплывалі.

Перш за ўсе трэба адзначыць, што да XI-XII стст. у Заходняй Еўропе і да XV- XVI стст. ва Ўсходняй Еўропе бязмежна панавала звычаёвае права. Узнікненне першых “варварскіх праўд” хоць і сведчыла пра тэндэнцыю пераходу ад родаплемянных адносінаў да ранняй дзяржаўнасці, адлюстроўвала спробы ўмацавання ўлады вайсковых правадыроў і іх пераўвасаблення ў кіраўнікоў (каралеў і князеў) і суддзяў свайго народа, але не з’яўлялася ў вузкім сэнсе гэтага слова заканадаўствам. Так, дзякуючы хрысціянству, права атрымлівала “святую” форму, падобную на тую, у якой захоўвалася Божае слова, але, па сутнасці, гэта былі зборы звычаяў, а іх запіс прадстаўляў сабой

хутчэй “настаўленне і перасцярогу храніць мір, захоўваць справядлівасць і ўстрымлівацца ад злачынстваў” [6, с. 78].

Часткова замацаваўшы звычаі, каралеўскае права пачало вельмі марудна развівацца праз прыняцце накіраваных на вырашэнне асобных, але важных задачаў тагачаснай дзяржавы дакументаў: заключэнне дамоваў з насельніцтвам пры прызванні на княжанне, выданне царкоўных уставаў (якія дазвалялі адасобіць юрысдыкцыю царквы і свецкай улады), заключэнне міжнародных гандлёвых дамоваў, а таксама мірных дамоваў з іншымі ўладарамі, у тым ліку і па выніках міжусобных войнаў.

Аднак большасць дадзеных нешматлікіх крыніцаў датычыліся публічнага права, насіла разавы характар, або, зноў жа, замацоўвалі звычаі, што склаліся ў міжнародных ці публічна-прававых стасунках, ці звычаі, якія склаліся ў адпаведнай зямлі, што далучалася да дзяржавы, і іх запіс успрымаўся мясцовым насельніцтвам як гарантыя пракавечных правоў. Нешматлікасць крыніц таго часу тлумачыцца, як адзначае Т. І. Доўнар, тым, што ў сярэднявеччы лічылася, што права існуе незалежна ад вярхоўнай улады і рэгуляванне прыватных адносінаў не ўваходзіць у кампетэнцыю апошняй [8, с. 20].

Падобная сітуацыя працягваецца на абшарах Усходняй Еўропы да канца XIV ст., калі на землях ВКЛ адбываецца ўздым зацікаўлення пісаным словам і пісаным законам. Якія ж фактары паўплывалі на пашырэнне пісанага права?

Перш за ўсе вылучым з’явы культуры, якія стваралі своеасаблівы фон пашаны да пісанага слова. Да іх мы аднясём распаўсюджанне праваслаўных ідэй ісіхазма, вынікі і здабыткі Папскай рэвалюцыі і пашырэнне перадрэфармацыйных ідэй, а потым і ідэй Рэнесансу, якія паслядоўна ў канцы XIV – XVI стст. прыходзяць на землі ВКЛ.

Першым фактарам, уплыў якога варта адзначыць у дадзеным кантэксце, з’яўляецца росквіт праваслаўнай культуры, які наступіў пасля перыяду “кансервацыі” XI-XII стст. [7, с. 210]. Так, у канцы XIII-пачатку XV ст. на праваслаўныя землі Ўсходняй Еўропы прыйшлі здабыткі містычнага руху афонскага манаства, што атрымаў назву ісіхазма. Выклікаўшы ўсплеск публічных дыскусій у Візантыі, ісіхазм парадзіў шматлікую пісаную літаратуру на грэцкай мове, а потым і яе пераклад і распаўсюджанне на тэрыторыі Русі [11, с. 171]. Такім чынам, ісіхазм паслужыў “імпульсам, які вывеў развіццё пісьменства са стану “кансервацыі” і абудзіў цікавасць і ўвагу да слова” [7, с. 221], прынёс з сабой хвалю паўднёваславянскіх тэкстаў, што сталі ўзорамі для мясцовага пісьменства XV ст. [7, с. 213, 221], а тым самым ствараў

агульны фон шанавання пісанага слова, які ў спалучэнні з іншымі фактарамі спрыяў станаўленню пісанага права.

Другім важным фактарам стала ўспрыняцце здабыткаў Папскай рэвалюцыі, якія праз польскія ўплывы пранікалі на землі ВКЛ. Барацьба свецкай і царкоўнай улады ў XI – XII стст. парадзілі бурны ўсплеск зацікаўлення пісаным словам, якое выступала зброяй у барацьбе дзвюх універсалісцкіх цэнтраў, якія жадалі падначаліць сабе хрысціянскі свет. І хоць польская дзяржава, а тым больш ВКЛ, былі перыферыяй дадзенай барацьбы, але заходнія тэксты,  ды сама культура шанавання і выкарыстання кніжнага слова не маглі не сказацца на поглядах мясцовай духовай і свецкай эліты.

Трэба адзначыць, што канкурэнцыя свецкай і духовай улады ў Цэнтральнай Еўропе мела свае асаблівасці. Так, для Польшчы барацьба з уплывамі Каталіцкай царквы была актуальная хутчэй як аспект змагання з нямецкім уплывам. Спачатку польская дзяржава актыўна супрацьдзейнічала ўніверсалісцкім памкненням нямецкага цэзарства і дамагалася асобнай польскай іерархіі каталіцкага касцёла, потым актуальным стала некаторае супрацьдзеянне папству і, асабліва, цэзарству, з-за прыхільнасці апошніх да Тэўтонскага ордэну. У XV ст. становіцца актуальнай і ўнутраная барацьба між каралеўскім дваром і групоўкай магнатаў на чале з біскупам Збігневам Алясніцкім.

Важным элементам польскага змагання з універсалісцкімі інстытутамі і Тэўтонскім ордэнам выступала права. Менавіта таму, каралеўская ўлада ў 1364 г. заснавала Кракаўскі ўніверсітэт, які браў для сябе ўзорам падкантрольныя дзяржаве італьянскія ўніверсітэты, перш за ўсе Балонскі. Навучальная ўстанова, што паказальна, мела скіраванасць у правазнаўчы бок – з трох факультэтаў адзін юрыдычны, з 11 кафедр – 8 прававых.

Барацьба з Ордэнам, змаганне за аўтаномію ВКЛ супраць інкарпарацыйных памкненняў палякаў таксама абумоўлівалі зацікаўленне элітаў Княства ў станаўленні юрыдычнай адукацыі і пісаным праве. Вядома, што канцлер ВКЛ Міхаіл Кезгайлавіч, пад кіраўніцтвам якога вялася распрацоўка прывілея 1447 г. і Судзебніка 1468 г., быў адным з мецэнатаў Кракаўскага ўніверсітэта, у каторым у XV ст. навучаліся і студэнты з Княства [14, с. 243].

Яшчэ адным фактарам, які ствараў атмасферу павагі перад пісаным правам у першай палове XV ст. быў уплыў чэшскіх рэфарматараў, які распаўсюджваўся праз актыўнае пранікненне чэхаў да каралеўскага і вялікакняскага двара, дыпламатычныя місіі гусітаў (напрыклад, візіт Іераніма Пражскага, які між іншымі месцамі наведаў Вільню і Віцебск), навучаннем студэнтаў з Кароны і Княства ў Празе, а

таксама ўдзелам пяцітысячнага войска з ВКЛ на чале з намеснікам вялікага князя Вітаўта Жыгімонтам Карыбутавічам у гусіцкіх войнах. Рэлігійныя ідэі гусістаў, як паказваюць сучасныя польскія даследаванні, не аказалі значнага ўплыву на рэлігійную сітуацыю ў польскай дзяржаве і ў ВКЛ [1, с. 210-211], якія выкарыстоўвалі гусістаў у сваёй барацьбе з цэзарствам і ордэнам, але агульныя ідэі пра прыярытэт каралеўскай улады над касцельнай, перавагу пісаных крыніц, у тым ліку праўных, над звычаем не маглі застацца без увагі жыхароў Польшчы і ВКЛ.

Пералічаныя перадрэфармацыйныя ідэі, што вынікалі з духу эпохі [3, с. 12], успрымаліся палітычнымі дзеячамі Польшчы і ВКЛ і абмяркоўваліся ў паleміках. Так, Ян Астрарог, дарадца каралёў Казіміра Ягелончыка і Яна Ольбрахта, у сваім "Мемарыяле аб ладзе Рэчы Паспалітай" (каля 1477 г.) выступаў за суверэнітэт манарха ў замежных справах, скасаванне анатаў да Рыма, ліквідаванне права апеляцыі на прысуды духоўных судоў да рымскай курыі, а таксама за пашырэнне пісанага права, каб "не паводле капрызаў адной асобы, але разважання многіх судзілі" [2, с. 159].

Праз невялікі час, ужо ў пачатку XVI ст., ідэі прыярытэта пісанага права знаходзім у Францыска Скарыны, які ў сваіх прадмовах да Першай кнігі царстваў і Кнігі другога закона Маісея, адзначае важнасць пісаных крыніцаў і законаў, пералічвае найвядомейшых заканадаўцаў мінулага, указвае на прыроджаны закон як падмурак для ўсіх пісаных законаў. Апошнія, што прымаюцца народам з яго старэйшынамі, і тут бачныя ўжо рэнесансныя ідэі патрыятызму, павінны адпавядаць звычаям кожнага краю, часу і месцу іх прымання і быць накіраванымі на дасягненне агульнага грамадскага дабра [12, с. 335; 13, с. 332].

Сярод палітычных прычынаў станаўлення пісанага права як асноўнай крыніцы права ў XIV - XVI стст. можна вылучыць распаўсюджанне новай канцэпцыі дзяржавы і манархічнай улады, яе ўзаемадачынення з насельніцтвам, а таксама пашырэнне праваў саслоўя шляхты. Так, да XIII ст. барацьба Цэзарства і Царквы прывяла да палемічнага ўзаемапранікнення канцэпцый улады. "..Дзяржава … усё больш выразна выяўляла тэндэнцыю да ператварэння ў нейкую квазіцаркву або містычную карпарацыю на рацыянальнай аснове" [9, с. 289-290]. Перанос ідэі corpus mysticum на дзяржаву асвячаў і ўздымаў яе над "фізічным існаваннем", а да таго ж перадаваў ёй юрыдычныя канатацыі як "фіктыўнай" або "юрыдычнай" асобы, "карпаратыўнага калектыву – неахопнага і існуючага толькі як фікцыя ў юрыспрудэнцыі" [9, с. 306-307]. Наступным крокам пасля "сакралізацыі" дзяржавы, што ўздымаў яе самакаштоўнасць і значнасць, было распаўсюджанне метафары шлюба караля з сваім каралеўствам па аналогіі з шлюбам

Хрыста або епіскапа з царквой [9, с. 310-312]. З шлюба манарха і дзяржавы вынікалі праўныя адносіны між імі, а значыць праўныя стасункі караля і станаў феадальнага грамадства [9, с. 317-321], якія паводле тагачасных поглядаў упадабляліся органам аднаго цела.

У выніку такой ідэйнай эвалюцыі адбываецца аддзяленне асобы караля ад дзяржавы, важным органам якой ён з'яўляецца, яго асабістых інтарэсаў ад інтарэсаў усяго палітычнага цела. І як адзіны арганізм царквы, які актыўна функцыянаваў у апоры на разгалінаваны апарат кіравання і сістэму кананічнага права, так і дзяржава атрымала ідэйны імпульс да актывізацыі праўнай дзейнасці, а саслоўі да праўнай рэгламентацыі адносінаў з манархам.

Падчас заключэння дынастычнай уніі паміж ВКЛ і Польскім каралеўствам у апошнім па заходняму ўзору ўжо адбылося адасабленне постаці караля ад дзяржавы – Corona Regni [5, с. 35], у той час як у ВКЛ усё яшчэ дамінавала патрыманіяльная канцэпцыя ўлады [5, с. 36-38]. Але ў наступным стагоддзі пад польскім уплывам, з-за частай адсутнасці ў Княстве супольнага манарха апошняя адышла ў нябыт.

Ад ідэі вышэйшасці і адрознасці Польшы, ад асобы караля адзін крок да ідэі звязанасці манарха правам. У Польшчы, а потым і ў ВКЛ, у XV і ў XVI адбываецца ўкараненне думкі *lex est rex, non rex est lex,* якая патрабавала для сваёй рэалізацыі на практыцы абавязковай кадыфікацыі і стварэння афіцыйнага звода права [4].

Дадзеныя ідэі з удзячнасцю ўспрымала шляхта ВКЛ. Яна з цікавасцю назірала за працэсам эмансіпацыі сярэдняй шляхты, што распачаўся ў Кароне яшчэ Кошыцкім прывілеем 1374 года і Нешаўскімі прывілеямі 1454 года, а таксама за дзейнасцю экзекуцыйнага руху ў XVI ст.

Аднак, калі кадыфікацыйныя ідэі ў Кароне спыніліся пасля прыняцця Статута Ласкага ў 1506 г. і Formula processus 1523 г., то ў Вялікім княстве інтарэсы манарха па ўніфікацыі краіны і цэнтралізацыі ўлады на некаторы час супалі з прагненнем шляхты, земляў абараніць свае правы. У выніку шэрага часам супадаючых, а часам супрацьнакіраваных інтарэсаў розных слаёў насельніцтва, земляў, гарадоў, цэнтральнай улады, з канца XIV па пачатак XVI стст. у ВКЛ адбываецца ўсплеск выдання пісьмовых актаў – агульназемскіх, абласных і валасных прывілеяў, грамат на магдэбургскае права.

Навацыя была ў тым, што княская ўлада ўмешвалася ў рэгуляванне не толькі публічных, але і прыватных узаемаадносін (ад кіравання, падаткаў, правасуддзя і крымінальнага права да грамадзянска-сямейных і спадчынных адносін). А так як дадзеныя правы і прывілеі ў свядомасці насельніцтва яшчэ цесна звязваліся з асобай

манарха, то кожны новы вялікі князь раз за разам на запыты зацікаўленых суб’ектаў пацвярджаў іх новымі і новымі прывілеямі, з кожным разам уносячы ў іх невялікія змены і дадаючы элементы сістэматызацыі. Кожнае наступнае выданне актаў у сваю чаргу прывучала насельніцтва да самой думкі аб нармальнасці дзяржаўнага рэгулявання прыватна-прававых грамадскіх адносінаў, закладвала падмурак для сістэматызацыі прававых норм.

Першымі яе спробамі ў ВКЛ стала выданне агульназемскіх прывілеяў 1447, 1492 і 1506 гг., а таксама Судзебніка 1468 г. [8, с. 23]. Аднак да прыняцця Статута 1529 г. насельніцтва ясна ўсведамляла адсутнасць адзінага пісанага права ў дзяржаве і ў пачатку XVI ст. жадала дадзеную сітуацыю змяніць, звязвала свае надзеі з манархам.

Выдаючы прывілей Валынскай зямлі ў 1501 г., сам вялікі князь указваў на яго часовы характар “пока права статута у отчизне нашей уставим”. Далей у прывілеі ўказвалася, што “тогда вси земли наши одного права держати мають и одним правом суждены будут подле статуту» [15, с. 28].

Шляхта падняла пытанне пра прыняцце агульнадзяржаўнага зводу на Віленскім сейме 1514 г., але магнатам, якія не былі ў ім зацікаўлены, удалося адцягнуць дадзенае рашэнне. На Гродзенскім сойме 1522 г. на чарговы запыт шляхты вялікі князь з радай “право им прирекли дати и тыи вси члонки, как ся поданные наши справовати и радити, казали есмо… выписати» [10, с.20]. Па прадстаўленаму сойму праекту яшчэ шэсць год адбываліся спрэчкі, і толькі на Віленскім сейме 1528 – 1529 гг. былі прынятыя “Права писаныя”, якія даследчыкі для зручнасці называюць Статутом 1529 г.

Такім чынам, права ВКЛ пад уздзеяннем мноства культурных, палітычных і прававых прычын, заходняга і візантыйскага ўплыву, уплыву перадрэфармацыйных і раннерэнесансных ідэй прыйшло да канчатковага станаўлення пісанага права як галоўнай крыніцы прававых норм, што знайшло асаблівае адлюстраванне ў Статуце 1529 г. Далейшая прававая гісторыя ВКЛ і Рэчы Паспалітай – гэта гісторыя пісанага права, дзе іншыя прававыя крыніцы адыгрываюць толькі дапаможную функцыю.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Guzowska D. Problem husycki *w* Polsce *w* pierwszej połowie XV wieku *w* świetle najnowszych badań // Studia Podlaskie. tom X. 2000. S.193-211.

2. Ostroróg J. Monumentum pro Reipublicae ordinatione // Pawiński, A. Jana Ostroroga żywot i pismo o naprawie rzeczy pospolitej: Studyum z literatury politycznej XV wieku. Warszawa, W druk. S.Orgelbranda synów, 1884. S. 121-181.

3. Pawiński A. Jana Ostroroga żywot i pismo o naprawie rzeczy pospolitej: Studyum z literatury politycznej XV wieku. Warszawa, W Wdruk. S.Orgelbranda synów, 1884. S. 1-119.

4. Uruszczak W. Swoistość systemów prawno-ustrojowych państw Europy Środkowo-Wschodniej w XV–XVI w. [Электронный ресурс] // Europa Środkowowschodnia od X do XVIII wieku – jedność czy różnorodność? / red. K. Baczkowski, J. Smołucha. Kraków, 2005. S. 45–61. Режим доступа: jazon.hist.uj.edu.pl/zjazd/materialy/uruszczak.pdf. Дата доступа: 8.07.2019.

5. Бардах Ю. Крэва і Люблін. З праблемаў польска-літоўскай уніі // Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага : пераклад з польскай і французскай; [укладальнік Г. Сагановіч; пераклад з польскай мовы М. Раманоўскага; пераклад з французскай мовы А. Істоміна]. Мінск : Медысонт, 2010. С.16-99.

6. Берман Г.Дж. Западная традиция права : эпоха формирования / Г.Дж. Берман ; пер. с англ. 2-е изд. М. : Изд-во МГУ ; Издательская группа ИНФРА-М – НОРМА, 1998. 624 с.

7. Гаранін С.Л. Другі паўдневаславянскі ўплыў і ўзнікненне перададраджэнскіх тэндэнцый у беларускай культуры позняга Сярэднявечча // Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. Т.2: Протарэнесанс і Адраджэнне / С.І. Санько [і інш.]; Нац. Акадэмія Беларусі; Інстытут філасофіі. Мінск: Бел навука, 2010. С.210- 248.

8. Доўнар Т.І. Развіцце асноўных інстытутаў грамадзянскага і крымінальнага права Беларусі ў XV – XVI стагоддзях. Мінск : Пропилеи, 2000. 224 с.

9. Канторович Э.Х. Два тела короля. Исследование по средневековой политической теологии. М.: Изд-во Института Гайдара, 2015. 752 с.·

10. Короткий коментар загальноі спрямованості Статуту 1529 р. // Статути Великого князіства Литовського: у 3-х томах. Том 1. Статут Великого князіства Литовського 1529 року / За ред.С.Ківалова, П.Музиченка, А.Панькова. Одеса : Юридична література, 2002. С.18-36.

11. Нижников С.А. Исихазм в истории христианства на Руси. Часть I // Пространство и Время. 2017. № 1(27). С. 160—173.

12. Скарына Ф. Прадмова да кнігі Другі закон //Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш.]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. 2-е выд. Мінскн. : Бел.навука, 2005. С.334-337.

13. Скарына Ф. Прадмова да першай кнігі царстваў //Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш.]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. 2-е выд., выпр. Мінск : Бел.навука, 2005. С.332-334.

14. Старостина И.П. Судебник Казимира 1468 г. // Древнейшие государства на территории СССР. Материалы и исследования, 1988-1989 гг. – М.: Наука, 1991. С.170-344.

15. Уставная грамота Литовскаго великаго князя Александра жителямъ Волынской земли, 15 февраля 1501 // Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России : собранные и изданные Археографическою комиссиею , в XV т. / ред. Н. Костомаров. СПб.: Изд. археографич. комиссии, 1863. Т. 1. 1361-1598. С.27-28.